Такая преемственность обеспечивает уникальную устойчивость системы. Традиционные ценности выступают в роли амортизатора при социальных потрясениях, а древняя философия «срединного пути» позволяет Китаю интегрировать западные технологии, не принимая при этом западную систему ценностей целиком. Взаимосвязь между древними текстами и современными пятилетними планами развития демонстрирует, что для Китая история – это не прямая линия, уходящая в прошлое, а циклическое обновление вечных истин. Ренессанс мудрости проявляется и в системе образования, где изучение классики становится обязательным элементом подготовки новой элиты, и в архитектуре, стремящейся к гармонии с природой, и в государственном управлении, где меритократия – власть достойных и образованных – вновь возводится в Абсолют. Таким образом, древние учения не просто выжили, они стали интеллектуальным каркасом, позволяющим Китаю претендовать на роль лидера новой эпохи, опираясь на авторитет пятитысячелетней цивилизации.

Сегодня, несмотря на кардинальные социально-политические трансформации и технологический прорыв, современный Китай сохраняет глубинную связь с философским наследием прошлого. Древние учения (конфуцианство, даосизм, легизм) перестали восприниматься как архаичные догмы, трансформировавшись в гибкую систему ценностей. Эта система, базирующаяся на принципах гармонии, иерархии и коллективизма, позволяет китайской цивилизации сохранять идентичность в условиях глобализации, а концепция «общества сяокан» демонстрирует, как архетипы древности успешно адаптируются к решению современных стратегических задач.

Список использованных источников

1. Рыков, С. Ю. Древнекитайская философия : курс лекций [Текст] / С. Ю. Рыков; Российской академии наук, Институт философии. – Москва : ИФРАН, 2012. – 312 с.
2. Конфуций Луньюй [Text] : изречения / Конфуций ; авт. предисл. И. И. Семененко. – Москва : ЭКСМО-ПРЕСС, 2000. – 464 с.
3. Дао-Дэ цзин Ле-цзы. Гуань-цзы : Даос. каноны / Пер. [с кит.] , вступит. ст. и коммент. В. В. Малявина. – Москва : Изд-во Астрель, 2002. – 540 с.
4. Кобзев, А. И. Легизм (фа цзя): законнический этатизм – этика тотальной власти // История этических учений: учебник / Под ред. А. А. Гусейнова. – Москва : Гардарики, 2003. – С. 12–31.

УДК 314; 39

СЯМ'Я Ў ТРАДЫЦЫЙНАЙ КАРЦІНЕ СВЕТУ БЕЛАРУСАЎ

Уткевіч В. І., к.філал.н., дац., Коршак А. А., студ.

Віцебскі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт,
г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь

Рэферат. *У артыкуле даследуецца месца і роля сям'і ў традыцыйнай карціне свету беларусаў. Адзначаецца, што ў традыцыйнай культуры беларусаў сям'я выступала як мікрамадэль светабудовы, дзе кожны яе член, яго роля і ўчынкі былі цесна звязаны з уяўленнямі аб належным, сакральным і паўсядзённым. Феномен сям'і разглядаецца ў трох аспектах: гнасеалагічным, анталагічным і сацыяльным. Сям'я – гэта не толькі спосаб анталагічнага быцця народа, але і спосаб пазнання сябе і навакольнага свету. Робіцца выснова аб значэнні сям'і як неабходнага асяроддзя для гарманічнага развіцця асобы і падмурку сацыяльнай стабільнасці грамадства.*

Ключавыя словы: беларусы, выхаванне, дзеці, духоўнасць, карціна свету, культура, радзіма, сям'я.

Тэма сям'і і сямейных адносін займае цэнтральнае месца ў сістэме каштоўнасцей любога народа. Сям'я з'яўляецца не толькі першаснай ячэйкай грамадства і асновай яго ўзнаўлення, але і галоўным захавальнікам культурнага кода, традыцый і светапоглядных установак. У традыцыйнай культуры беларусаў сям'я выступала як мікрамадэль светабудовы, дзе кожны член, яго роля і ўчынкі былі цесна звязаны з уяўленнямі аб належным, сакральным і паўсядзённым. Вывучэнне таго, як сям'я ўспрымалася ў карціне

свету продкаў, дазваляе глыбей зразумець вытокі нацыянальнага менталітэту і каштоўнасныя арыенціры, якія фарміраваліся стагоддзямі. Актуальнасць дадзенага даследавання абумоўленая некалькімі фактарамі. Па-першае, у сучасным свеце, які характарызуецца глабалізацыяй і размываннем традыцыйных каштоўнасцяў, назіраецца павышаная цікавасць да гісторыка-культурнай спадчыны і пошуку нацыянальнай ідэнтычнасці. Зварот да вытокаў дапамагае асэнсаваць працэсы, якія адбываюцца ў сучаснай беларускай сям'і. Па-другое, рэканструкцыя традыцыйнай карціны свету садзейнічае захаванню гістарычнай памяці і перадачы духоўнага вопыту наступным пакаленням. Па-трэцяе, вывучэнне дадзенай тэмы дазваляе выявіць устойлівыя архетыпы сямейных паводзін, якія, трансфармуючыся, працягваюць уплываць на сацыяльныя адносіны і сёння.

Папярэдне неабходна адзначыць, што само паняцце "карціна свету" знаходзіць сваё шырокае прымяненне ў розных галінах навуковых ведаў. У сувязі з гэтым існуе блізкае спалучэнне – навуковая карціна свету. Акрамя навуковай, мы маем справу са штодзённай карцінай свету, якая выяўляецца як на індывідуальным узроўні, так і на сацыяльным, у тым ліку нацыянальным. Вядома, у штодзённай гаворцы тэрмін "карціна свету" ўжываецца рэдка. Як сказана ў Вялікай расійскай энцыклапедыі: "Карціна свету (вобраз свету, мадэль свету; англ. world view, ням. Weltanschauung) – сістэма ўяўленняў аб рэальнасці (ад светабудовы ў цэлым да бліжэйшага атачэння, імгненнага кантэксту дзейнасці), характэрных для індзіда або сацыяльнай групы (прафесійнай, этнічнай, рэлігійнай, саслоўнай, моўнай і інш.)" [1]. Карціна свету сінтэзуе ўяўленні людзей аб прыродзе, духоўным свеце, грамадстве, аб саміх сабе і складае адзін з падмуркаў культуры народа ў цэлым. Нароўні з паняццем "карціна свету" шырока выкарыстоўваецца такое паняцце, як светапогляд. Па сутнасці, абодва яны шмат у чым падобныя, іх адрозненні маюць неістотны характар і ў першую чаргу вызначаюцца суб'ектыўнымі фактарамі, г.зн. актыўным стаўленнем чалавека да самога сябе і навакольнай рэчаіснасці. Аднак нягледзячы на дадзенае адрозненне, мы будзем надалей ужываць такія паняцці, як "карціна свету беларусаў" і "светапогляд беларускага народа" ў якасці тоесных.

Вядома, што ў карціне свету беларусаў адно з вядучых месцаў займае паняцце сям'і. Мы разгледзім паняцце сям'і ў трох аспектах: гнасеалагічным, анталагічным і сацыяльным. Можна з упэўненасцю канстатаваць, што сям'я – гэта не толькі спосаб сацыяльнага быцця народа, але і спосаб пазнання сябе і навакольнага свету. Такім чынам, найважнейшым разуменнем сутнасці сям'і з'яўляецца яе гнасеалагічная характарыстыка. Справа ў тым, што ў сям'і чалавек спазнае не толькі людзей, якія атачаюць яго, але і самога сябе. Найперш гэта тычыцца адносінаў мужа і жонкі, якія кладуць пачатак сям'і: абодва раскрываюць свае якасці такім чынам, што на гнасеалагічным узроўні рэалізуецца пэўны ўстойлівы вобраз-выява іншага "я", шмат у чым супрацьлеглы свайму "я", але адначасова і тоесны яму, як складнік адзінай сям'і. Само паняцце "вобраз" мае ў сваю чаргу шмат значэнняў. Яно непасрэдна ўзаемазвязана з адукацыяй. Вось што піша пра гэта найбуйнейшы нямецкі філосаф XX ст. Х.-Г. Гадамер: "Тым не менш перамога слова "адукацыя" над "формай" уяўляецца невыпадковай, бо ў "адукацыі" (Bildung) хаваецца "вобраз" (Bild). Паняцце формы саступае перад той таямнічай двухбаковасцю, з якой "вобраз" уключае ў сябе адначасова значэнні адлюстравання, злепка (Nachbild) і ўзору (Vorbild) [2, с. 52]. Гэткая супрацьлегласць і адначасова тоеснасць атрымліваюць пэўнае прымірэннне ў дзецях, якія нясуць у сабе як вобраз бацькі, так і вобраз маці. У гнасеалагічным кантэксце сям'я можа быць разгледжана і як пэўная мадэль, ўзор рэчаіснасці. Гэтая думка асабліва слушная ў дачыненні да сферы ўзаемаадносін паміж бацькамі і дзецьмі. Назіраючы паводзіны сваіх дзяцей, у працэсе выхавання муж і жонка тым самым прыгадваюць сваё маленства, яны своеасабліва мадэлююць свае уласныя дзіцячыя перажыванні і захапленні. Акрамя таго, навучыўшыся разумець логіку дзіцячых дзеянняў і асаблівасці іх мыслення, яны лепш могуць аналізаваць псіхічныя працэсы ў саміх сабе. Прычым гэтае спазнанне па сваёй глыбіні вельмі моцнае, і яго пазбаўлены людзі, якія не стварылі сям'і і не маюць дзяцей.

Анталагічная і гнасеалагічная сутнасць сям'і цесна ўзаемазвязаны паміж сабой. На наш погляд, дадзеная ўзаемасувязь дэтэрмінаваная не толькі суб'ектыўнымі фактарамі, але таксама і шэрагам аб'ектыўных. А першую чаргу сказанае адносіцца да такога найважнейшага культураспараджальнага фактару для беларусаў, як родная зямля. Зямля для нашага народа – гэта не толькі месца пражывання, але і месца станаўлення чалавека ў якасці нацыянальнай асобы. Многія творы класічнай беларускай літаратуры пацвярджаюць гэтую думку: "Новая зямля" Я. Коласа, "Зямля" К. Чорнага, "Зямля пад белымі крыламі" У.

Караткевіча і інш. У старажытнасці сям'я ў карціне свету беларусаў будавалася менавіта вакол зямельнага надзелу, доўгі час праца на зямлі была самай галоўнай, вызначальнай. Зараз, безумоўна, большасць жыхароў Беларусі жыве ў гарадах (па апошніх дадзеных – 78,9 %), аднак адзначым, што сувязь з зямлёй захавалася, напрыклад, у такім феномене, як сямейнае лецішча. Праца на ўласным кавалку зямли за горадам – гэта не столькі надзённая неабходнасць у гародніне і садавіне, колькі надзённая неабходнасць збірацца разам, спосаб анталагічнага аб'яднання розных пакаленняў сям'і. Неабходна адзначыць, што сям'я з'яўляецца асаблівай анталагічнай адзінкай у першую чаргу ў сацыяльным аспекце, і гэта падрабязней разгледзім ніжэй. А тут заўважым, што не толькі сям'я ў агульным уяўляе сабой анталогію рэчаіснасці, але такую анталогію ўяўляюць сабой і асобныя яе члены. Важна разумець, што анталагічнае месца мужа і жонкі ў сямейнай іерархіі вызначаецца іх правамі і абавязкамі. Згодна з традыцыйным беларускім светапоглядам, адказным у сям'і павінен быць бацька, прычым такое становішча дэтэрмінавана не толькі правамі, але ў першую чаргу яго абавязкамі. Муж, як галоўны ў сям'і, нясе адказнасць не толькі за свае паводзіны, але і за жонку, дзяцей, іншых сваякоў, якія жывуць у адной хаце і патрабуюць апякунства. Дарэчы, правы і абавязкі ў сям'і мае кожны, у тым ліку і дзеці. Вядома, пры нараджэнні малое дзіця першы час цалкам залежыць ад бацькоў, таму пра правы немагчыма казаць, аднак па меры свайго ўзрастання дзеці пачынаюць валодаць правам, напрыклад, карыстацца сямейнай маёмасцю. Адпаведна, у іх зяўляюцца і пэўныя абавязкі. Адзначым, што ў традыцыйных беларускіх сем'ях абавязкі прывіваліся дзецям у дастаткова раннім узросце. Натуральным было, што старэйшыя браты і сёстры даглядалі і дапамагалі выхоўваць малодшых, а таксама выконвалі пасільныя працы ў хаце ці па гаспадарцы.

Трэці важны аспект аналізу феномена сям'і – сацыяльны. Безумоўна, ён цесна ўзаемазвязаны з гнасеалагічным і анталагічным, якія, па сутнасці, таксама маюць сацыяльнае значэнне. Неабходна адзначыць, што сям'я з'яўляецца не проста складнікам пэўнай нацыянальнай супольнасці, яна сама ёсць мікрасоцыум, асяроддзе для гарманічнага развіцця і выхавання чалавека і грамадзяніна. Бацька традыцыйна перадаваў сыну сваё рамяство, а калі той абзаводзіўся ўласнай сям'ёй – дапамагаў пабудаваць дом, набыць жывёлу, дачцэ даваў пасаг. Сялянскія дзяўчынкі да паўналецця з дапамогай маці праходзілі поўны працэс сацыялізацыі, атрымаўшы неабходныя жыццёвыя навыкі. Вось чаму такое вялікае значэнне надаецца інстытуту сям'і і ў сучасным беларускім грамадстве, дзяржава робіць усё неабходнае для яе падтрымкі. Дадзеная падтрымка не толькі матэрыяльная і юрыдычная, але сацыялтная і псіхалагічная таксама – праз стварэнне пазітыўнага вобраза ў медыяпрасторы моладзі даецца першасны штуршок, настрой на стварэнне моцнай сям'і. Адмысловую падтрымку маюць вялікія шматдзетныя сем'і, прычым падьрымка тычыцца ўсіх членаў сям'і, не толькі дзяцей. Асаблівая ўвага надаецца вырашэнню праблем дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў У Беларусі шырокае распаўсюджванне атрымалі так званыя дзіцячыя дамы сямейнага тыпу. Дзякуючы іх існаванню многія дзеці выхоўваюцца не ў інтэрнатах, а, па сутнасці, ў звычайных шматдзетных бацькоўскіх сем'ях. Сям'я заўсёды разглядалася ў народнай хрысціянскай традыцыі не толькі як храналагічна абмежаваная сукупнасць людзей, але і як пазачасавая агульнасць сваякоў. Памерлыя продкі лічыліся такімі самымі членамі сям'і, як і тыя, хто жыве, аб іх пастаянна маліліся, некалькі разоў на год наведвалі могілкі, кожны ведаў свой радавод на некалькі пакаленняў. Такая мадэль светаўспрымання надзяляла род асаблівай анталагічнай цэласнасцю, у якой смерць не перарывала сацыяльную камунікацыю, а толькі змяняла яе форму. Успрыманне сям'і як пазачасавай агульнасці садзейнічала фарміраванню ўстойлівых механізмаў трансляцыі сацыяльнай памяці і сямейных каштоўнасцей. Культ продкаў і практыкі іх рэгулярнага памінання выконвалі найважнейшую функцыю кансалідацыі роду, падтрымліваючы ідэнтычнасць і пераемнасць пакаленняў ва ўмовах патрыярхальнага ўкладу.

На заканчэнне неабходна адзначыць, што моцную, сацыяльна арыентаваную дзяржаву часта параўноўваюць з сям'ёй, асабліва ў славянскіх народаў: "Канцэпт "сям'я" можа выкарыстоўвацца аўтарамі публіцыстычных тэкстаў для пабудовы канцэптуальнай метафары "дзяржава – гэта сям'я". Такая канцэптуальная метафара мадэлюе адносіны паміж дзяржавай і грамадзянамі, лідарам і народам, паміж рознымі суб'ектамі палітычнай дзейнасці. Метафара роднасці традыцыйна ўжывалася ў тэкстах палітычнай тэматыкі" [3, с. 129]. Падобную думку выказваў ў старажытнасці кітайскі філосаф Канфуцый. Вядома, дадзеная сентэнцыя справядлівая ў адносінах далёка не да ўсіх дзяржаў. Яна паказвае, па-першае, што ў дзяржаве склалася пэўная іерархія і ўсталяваўся парадак; па-другое, як і ў сям'і, яе грамадзяне не толькі валодаюць правамі, але і выконваюць вызначаныя абавязкі.

А найгалоўнае заключаецца ў тым, што ўсіх грамадзян у такой дзяржаве аб'ядноўваюць не выключна практычныя матэрыяльныя рэчы, але важныя духоўныя складнікі: вера, традыцыі, патрыятызм. На нашу думку, беларуская дзяржава цалкам адпавядае прадстаўленаму ўзору.

Спіс выкарыстаных крыніц

1. Картина мира // Большая российская энциклопедия. – Текст : электронный. – Режим доступа: https://bigenc.ru/c/kartina-mira-7ad88d. – Дата доступа 28.04.2026 г.
2. Гадамер, Х.-Г. Истина и метод. Основы философской герменевтики / Х.-Г. Гадамер. – Москва: Прогресс, 1988. – 704 с.
3. Калеснікава, А.А. Канцэпт "сям'я" ў моўнай карціне свету беларусаў: развіццё і функцыянаванне // Веснік МДПУ імя І. Шамякіна. – 2012. – №4 (37). – С. 127–131.

УДК 001:94(476)

НАВУКОВЫЯ ДАСЯГНЕННІ І ПЕДАГАГІЧНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ СТАНІСЛАВА БАНІФАЦЫЯ ЮНДЗІЛА

Хаданёнак В. М., к.г.н.

Віцебскі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт,
г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь

Рэферат. *У артыкуле разглядаецца жыццёвы шлях, творчыя набыткі і навуковыя дасягненні вядомага беларускага вучонага С. Б. Юндзіла. Асаблівая ўвага надаецца яго педагагічнай дзейнасці і ўкараненню навуковай спадчыны ў галіне мінералогіі і прыкладной батанікі.*

Ключавыя словы: Віленская акадэмія, школа піяраў, прыкладная батаніка, мінералогія, батанічны сад.

6 траўня 1761 г. у вёсцы Ясянцы Лідскага павета ў сям'і дробнай шляхты нарадзіўся Юндзіл Станюлаў Баніфацы. Братоў і сясцёр у Станіслава было шмат, і хлопчык меў мала шанцаў атрымаць вышэйшую адукацыю, пра якую марыў. Пачатковыя веды ён атрымаў ад хатніх настаўнікаў у бацькоўскім доме. Частку заняткаў настаўнікі праводзілі на лацінскай мове. Вось чаму Станюлаў Баніфацый яе так добра ведаў [1]. Затым тры першыя класы скончыў у піярскім калегіюме ў Лідзе. Тады шаснаццацігадовы юнак сур'ёзна ўзнамерыўся пасвяціць сябе ў духоўны сан у ордэне піяраў, у якім яму адкрываўся шлях да вышэйшай адукацыі.

У Любяшоў на Валыні ў 1777 г. С. Б. Юндзіл прыехаў для праходжання ордэнскага навіцыяту. У новай школе яму пашчасціла натрапіць на такія даведнікі, якія адпавядалі яго ахвоце да навук і яго схільнасцям. Увесь вольны час ён праводзіў за кнігамі. За гэта прыйшлося заплаціць пад канец сваёй вучобы ў навіцыяце стратай зроку правага вока. Атрымаўшы пасвячэнне на ксяндза, ён два гады настаўнічаў у піярскіх школах, спачатку ў Расенях, а потым у Вільні.

У 1781–1784 гг. Станюлаў Баніфацы працягвае вучобу ў Віленскай акадэміі, дзе вывучае філасофію, геалогію, фізіку, хімію, тэалогію. Яму даводзіцца слухаць лекцыі па гісторыі прыроды вядомага французскага вучонага, біёлага і ўрача Жана Эмануэля Жылібера. Лекцыі Э. Жылібера слухала невялікая група студэнтаў-мяшчан. Студэнты-шляхціцы, як правіла, іх ігнаравалі з прычыны забабонаў, што трывала панавалі ў краіне, паводле якіх займацца хіміяй, фізіялогіяй, медыцынай і іншымі прыродазнаўчымі навукамі, якія патрабавалі арганізацыі доследаў, лічылася зневажальным для асоб шляхецкага паходжання.

Да таго часу Юндзіл акрамя лацінскай ведаў польскую, рускую, французскую, нямецкую мовы, а таксама, відаць, літоўскую і беларускую. Але з усіх навук яго найбольш цікавілі прыродазнаўчыя. Асноўным яго інтарэсам хутка стала батаніка – навука, да таго часу занядбаная ў школах. Тады ж С. Б. Юндзіл выконваў абавязкі дазорцы канвікту, а ў астатні час слухаў лекцыі ў Акадэміі.

У 1785 г. Станюлаў Баніфацы адбывае ў Шчучын, дзе прымае кіраўніцтва школай піяраў. Яму належыць аўтарства рэфармавання ў ёй выкладання ў адпаведнасці з новым статутам